

# Урок 86

Параўнай розныя спосабы вылічэнняў.



Спосаб 1

1. Спачатку даведаюся, колькі бананаў у адной скрыні. $(3 \cdot 4) \cdot 2$
2. Потым даведаюся, колькі ўсяго бананаў у дзвюх скрынях.

Спосаб 2

1. Спачатку даведаюся, колькі звязкаў бананаў у дзвюх скрынях. $3 \cdot (4 \cdot 2)$
2. Потым даведаюся, колькі ўсяго бананаў у дзвюх скрынях.

$$(3 \cdot 4) \cdot 2 = 3 \cdot (4 \cdot 2)$$

**Спалучальная ўласцівасць множання**

Пры выкананні множання два суседнія множнікі можна замяніць іх здабыткам.

$$a \cdot b \cdot c = (a \cdot b) \cdot c = a \cdot (b \cdot c)$$

**1.** Колькі кубікаў выкарыстаў Пеця? Вылічы рознымі спосабамі.



**2.** Параўнай.

$(16 \cdot 2) \cdot 5$ ? $16 \cdot (2 \cdot 5)$

$200 \cdot 3 \cdot 2$ ? $200 \cdot (3 \cdot 2)$

**3.** Вядома, што $4 \cdot 86 = 344$. Знайдзі значэнні здабыткаў.

$4 \cdot 86 \cdot 10$ $\quad$ $(4 \cdot 86) \cdot 100$

$4 \cdot (86 \cdot 1000)$ $\quad$ $86 \cdot 4 \cdot (50 \cdot 2)$

**4.** Рашы ўраўненні.

$m : 4 = 24\,327$ $\quad$ $b \cdot 5 = 325\,585$



Правообладатель Национальный институт образования



**5.** Цяпер чвэрць пятай гадзіны.
- Каторую гадзіну паказваў гадзіннік 32 мін таму назад?
- Каторую гадзіну пакажа гадзіннік праз 57 мін?

**6.** Трактарыст за 5 дзён узараў на 25 га зямлі менш, чым за 10 дзён. Колькі гектараў зямлі ўзараў трактарыст за 10 дзён, калі штодзень ён узорваў аднолькавую плошчу зямлі?

**7.** Мама і тата купілі сабе білеты на цягнік па цане 45 р. 50 к. кожны. Для разліку яны далі банкаўскую картку, на якой было 250 р. Колькі грошай засталося на банкаўскай картцы пасля пакупкі білетаў?

**8.** У атэлі бацькам прапанавалі на выбар некалькі нумароў:

нумар «люкс» — 85 р. за суткі;
нумар «камфорт» — 61 р. за суткі;
нумар «стандарт» — 53 р. за суткі.

Ці хопіць рэшты грошай на картцы, каб зняць адзін з нумароў на двое сутак?

**?** Закончы сказ.
«Пры выкананні множання два суседнія множнікі …».

**1.** Вылічы.
$(3 \cdot 18) \cdot 10 \cdot 100$ $\quad$ $3 \cdot (18 \cdot 10) \cdot 100$

**2.** На 13 аднолькавых камбінезонаў пайшло на 24 м тканіны менш, чым на 19 такіх камбінезонаў. Колькі метраў тканіны пайшло на 13 камбінезонаў?



Правообладатель Национальный институт образования